БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[б]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 45. Менск. Нядзеля 19 мая 1918 г. Год

АБВЕСТКА.

Менская Местовая Управа гэтым даводзіць да агульнага ведама, што у Будоунічым аддзеле Управы, у Аутарак 22 мая у 12 гадзін дня адбудзецца устны торг, ператоржка і сараунаванне у закрытых копэртах на дрэуляныя баракі і іншыя рэчы с складау на **Курасоушчыне** і з другіх складау.

Асобы ахвочыя да торгу могуць аглядаць баракі і інш. рэчы на мейсцу, а кандыцыі да торгу штодня ад 10 гадзіны з рана да 4 гадзіны дня у Будоунічым аддзеле Управы.

Да часу торгу павінен быць паложаны залог у 5% прапанаванай сумы.

Член Управы
Інжынэр **В. Цывінскі**.
Дзелавод **А. Гноінскі**.

Менск 19/г.

Адраджэнне Дзержавы.

Мы, усе тутэйшыя людзі, беларусы і нібеларусы, любім свой край, прывыклі да яго і на чужыне нашае сэрцо чуець жаль па нашай ціхай Бацькаушчыне с яе і добрымі і благімі людзьмі і рэчамі.

Склад жыцця Беларусі саусім асобы, свойскі, складауся ен векамі, маець сваі традыцыі і свой ко.сэрватызм, гэта і робіць край самабытным.

Беларуская дзержава маець усе фундамэнты для будовы і гэтаго вымагаюць інтарэсы нацыянальныя, эканамічныя, палітычныя і соцыяльныя.

Формуецца цяпер новы Сэкрэтарыят ідэальнай беларускай дзержавы, каторую трэба давясьці мудрай працай да рэяльнай формы.

Апрыч больш прастой арганізацыі звычэйнаго грамадзянскаго парадку, адміністрацыі, юстыцыі і паліцыі і мейсцоваго самаупраулення, каторую робяць у нас окупацыйныя улады разам з мейсцовымі людзьмі—есьць іншэ справы вышэйшаго дзержаунаго парадку, каторыя датыкаюцца інтарэсау усяго краю і усяго народу.

Гэту важную мэту і павінен паставіць сабе Сэкрэтарыят. Трэба вырабіць констытуцыю Беларусі, зацьвердзіць яе міжнароднае становішчо, зевысунуць яе жыццевыя патрэбы.

Палітычнае і дыпломатычнае «мясо».

Астатнюю пару векоу быу упадак нізалежнасьці «Вяліката княства Літоускаго». Гэтаму прычыніліся, дзякуючы географічнаму стапу Беларусі, пасярэдзіне між Захадам і Усходам, і Масква і Польшча зрабілі з беларускаго народу нейкую массу, над каторай рабілі экспэрымэнты паляні, а потым і расійскі імпэрыялізм. А астатнія часы і большэвіцкія цэнтралісты зрабілі з «Западной Области» нейкае дыплематычнае «мясо». З лепкай рукі старых расійскіх дыплематау, нашы суседзі пробуюць забіраць па кавалку беларускую зямлю.

Мы верым што наш новы Сэкрэтарыят будзе мець падтрыманне усяго беларускаго народу пры «зьбіранні» нашай зямлі, нашы дзяды сталецьцямі баранілі сваі межы і склалі за іх сваі косьці ні для таго, каб унукі далі парэзаць на кускі Дзедаушчыну.

Німа цэнтру.

Хто нападзець цяпер у правінцыю нашу відзіць, як край увесь узяуся за працу, сеюць, будуюць, гародзяць; гандаль пробуець арганізавацца пры новых эканамічных і окупацыйных варунках. Ні гледзючы на цяжкі час, рэмесленны і фабрычны труд робіць высілкі, каб пусьціцца у рух.

Ніхватаець нам краеваго цэнтру, куды маглі бы звярачывацца усякія грамадзянскія арганізацыі і гдзе бы усе жыцце краю прыводзілося у стройную сыстэму і парадак. Инога заданнеу стаіць прэд Народным Сэкрэтарыятам.

Абразкі с правінцыі. *)

З Барысаўшчыны.

IV.

Адсьвяткавалі беларусы сёлета і другі Вялікдзень: першы—7-га красавіка—каталіцкі; другі—5-га мая—праваслаўны. Сьперша праваслаўныя клялі на чым сьвет стаіць каталікаў за іх атсталасьць, але па вёсках самі ціханька падсьвятковывалі:—«хай ім моль пяты паабʼедае, але рабіць ні-выпадае: хто іх там разьбярэ, чый праўдзівейшы Вялікдзень». Цяпер каталікі падкіпавалі с правасланых, што спозніліся «с козамі на торг», але так сама нівытыкалі посу с хаты, каб нібрацца за работу і сьціха—па кутках падпевалі «алелюю».

Але калі гэтак і дальш пойдзе дубэльтавацца: па дзьве градавыя, па дзьве ледавыя, па дзьве радаўніцы, па дзьве сёмухі, па дзьве Пятроўкі, ды па двух Пятровых бацькоў, то гэтыя жарты вельмі дрэнна могуць скончыцца для нашаго хлебаробства. Наш беларус—абы якая прычэпка—а пасьвяткаваць любіць. Дык трэба нашаму праваслаўнаму і каталіцкаму духавенству неяк згаварыцца, каб добра растлумачыць селяніну, чаго каторы мае трымацца.

А што іншэ горш: абы сьвяты, чы прысьвятак — у вёсцы вечарынка;—вельмі ўжо ласая цяперашняя моладзь да вечарынак. Што-ж і вечарынка гэтак цяпер у нас ігрышчо называюць, ні кепская рэч: на тое і моладасьць, каб павясяліцца. Але каб вы пачулі, ды пабачылі гэтыя вечарынкі! Толькі сьмех і грэх. Німа ні тэй свабоднай вясёласьці, ні здаровых сьмехаў і жартоў, ні сваіх даўнейшых гульняў; а якія песьні, якія вопраткі!

Атласы і едвабы—у дзеўчат; сурдуты, ні то ліха ведае што—у хлапцоў; крахмалевыя каўняры туга падпіраюць галаву, што ёй хлопец і пакруціць свабодна ні можа, а мусіць увесь, як калода паварачывацца; на крахмалёвых манішках—зікратыя гальштукі з бліскучымі розпакалёрным шклом шпількамі. І ўся гэта цудацкая адзежына ляжыць і прыстае да дзеўчат і хлапцоў акурат, як сядло да сьвіньні. А якія паны! Глянуўшы на іх сам ніведаіш, чы сьмеяцца, чы кідацца ратаваць людзей ад нейкай заморскай хваробы. А што да гутаркі і песьняў, то толькі дзівавацца трэба, як можна спанівераць тыя вуглы і тыя стрэхі дзе радзілася і скуль выйшла гэта самая моладзь.

Даўней—да вайны маскоўская салдатчына трымалася у нашаго беларуса толькі да тэй пары, пакуль ні стопчэ салдацкіх падноскаў, цяпер—так яна ўелася, што гэта зараза хіба злезе разам з маскоўскімі халявамі, а пакуль што яна толькі больш распаўсюджываецца.

Трэба, ні адкладаючы, ратаваць вёску ад гэтай заразы. І перш-на-перш за гэта павінны ўзяцца тыя сьвежыя і новыя сілы, якія за апошнія годы прылучыліся да розных беларускіх арганізацый. Гэта найбольш праўдзівыя сыны вёскі, маладыя, поўныя іншэ рухавасьці і жыцця, і вёска ні толькі з імі, але можа пайсьці за імі. Па гарадох ім цяпер німа чаго рабіць: час мітынговай палітыкі скончыўся; толькі праўдзівыя, по[ва]жныя палітыкі ніхай пільнуюць палітыку, а рэшта ўсім хутчэй туды—ва ўсе куткі Беларусі! Там, калі яны праўдзівыя беларусы, жджэ іх вялікая і пачэсная праца.

Я. Ш.

*) Гл. № 39, 43, 44.

Агульныя весткі.

ШТОКГОЛЬМ 13 гм. Подлуг ангельскіх газэтаў на Мурманскім пабярэжжу у Барыса-Глебскім округу—абшарам каля 1 кв. кілом.—знайходзячымся на левым берагу р. Пасвіч, гранічучым з норвэжскай тэрыторыяй, прызнаным за Расіяй руска-нарвэжскім трактатам 1826 г., цяпер вывешаны фінляндскі сьцяг. Каб гэта заўладанне зрабілася сталым—значылася-б што Фінляндзія стане на берагу Лядавітаго мора.

ВЕНА. 14 гм. Добра ась[вя]вядомленыя палітычныя кол[ы] ведаюць аб падробнасьцях про[]экту болей цеснаго хаўрус[у] паміж Нямеччынай і Аўстра[-]Угоршчынай, аб чым пастаноў[]лено у Нямецкай глаўнай Ква[]тэры.

Мілітарныя умовы з абоі[х] старон маюць быць так зблі[]жаны, што можна гаварыць аб пэўнаго роду мілітарнай конвэнцыі; з гаспадарскаго бо[]ку намечаецца як можна да[]лёка ідучая супольнасьць, ка[]торая ніпазбыўна асабліва у пераходны час. Хаця пры гэ[]тым маецца на відоку уйсьц[і] ад усяго-б што магло, здавацц[а] скірованым проці іншых ган[]длёвых дзержаваў, гандлёва[я] мытняя унія ёсьць магчыма[я] подлуг нарысованымі абойм[а] старанамі праэктаў.

Форма новаго хаўрусу ма[е] быць подлуг сьціслых перагавораў зазначана спосабам, як адрожнівацьме яе ад даўнейшай. Гэта ні будзе больш па[]таемнай дыплёматычнай умовай але хаўрус зацьверджаны подлуг артыкулаў аснаўных уставаў абоіх дзержаваў; займаць ён будзя ўсе народовыя рэпрэзэнтацыі Нямеччыны і Аўстра-Угоршчыны і запатрабуе іх зацьверджэння.

ШТОКГОЛЬМ. Як паведамляюць штокгольмскія газэты адбыўся гэтымі днямі у Хрысьціяніі вельмі сенсацыйны працэс. Рэч была аб адным шпіоне, каторы перэдаваў нарвежскія тэлеграмы чужым урадам. Ен працаваў у Дэнэнмарку, Нарвезі і Штокгольму, прадаючы кожную тэлеграму па сто крон. Такім чынам ангельскія і францускія агенты выведывалі шыфраваныя тэлеграмы цэнтральных дзержаваў. Яго асудзілі на 30 дзён арэшту.

— Чутка аб том, што Польшча прылучаецца да Аўстрыі аказуецца ніпраўдзівай. Ідуць перагаворы аб таможных адносінах Польшчы да цэнтральных дзержаваў,— Аўстрыі і Нямеччыны (Фосс. газэта № 248).

— У Англіі умацоўваецца нідастача каменнаго вугля—ядынаго тамака апал[]

Бракуе рабочай сілы для яго дабывання. Вывоз з Англіі проціў спакойнага часу зменшыўся на 40%.

Отпуск вугля электрычным і газовым заводам зменшыўся проці 1917 году на 15%;—для прыватных асобаў на 25%. Аустэрыі, рестарацыі, клюбы, зачыняюцца абавязкова у 10½ гадзін. (Фосс. газ. № 248).

— «Крыжовая газэта» мае весткі, што на Вялікага князя Літвы намечаецца кандыдатура члена Саксонскага пануючага дому. «(Kreuz. Zeit.» № 247).

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Харчэванне горада, пачынаючы ад 15 мая, як вядома, уступіло у новую паласу—выдачы па новым бонавым кніжкам ні толькі хлеба, але і цукру (па ¼ ф. на 2 тыдні). Фактычна выдача цукру ні толькі 15-го, але 16-го і 17-мая у шмат крамах ні пачалася, с прычын ніразвозу цукру своечасна па крамах. Так сама ні аддалі насяленню доуг за Вялікодны тыдзень па 1 фунту хлеба на кожную порцыю.

Местовы харчовы камітэт запэуняе, што паехаушыя у Хэрсонскую, Полтаускую і Кіеускую губэрні дзеячы камітэта будуць глауным чынам напіраць на ц у к е р, у каторым чуецца у нас такая вострая нідастача, і што гэты цукер да Чэрвеня будзе дастаулены у Менск, пасьля чаго мажліва павялічэнне пайка. Дай Бог, каб гэтак выйшло на праўду!

Гэтымі днямі мае прыбыць у Менск партыя гарбаты і мукі.

Выдача мяснага пайка мае так-сама пачацца к чэрвеню. Мясны контрагэнт Леукоу прыймае цяпер меры па арганізацыі закупак і дастаукі мяса і сала.

Крэстны ход с крэстовай царквы архіерэйскага дома у Крупцы з мейсцовавважанаю іконаю Божай Маці «Крупецкаю» адбудзецца заутра, г. з. 19 мая у 2 гадз. у дзень.

Рух уцекачоу з Менску у Літву, Прыбалтыку і Польшчу прыняу апошнімі днямі зусім пляномерны характар—партыямі у 800 чалавек, пасьля прышчэплівання воспы і рээміграцыйных фармальнасцеу у бежанскіх камітэтах.

Скарбонарчны збор і летэрэя-алегры на карысьць галадаючых дзяцей с прычын матэрыяльнага ніусьпеха «Тыдня апекі» адбудзецца заутра, г. з. 19-го мая.

Афіцэрскае бюро уладжывае гэтымі днямі грандыёзную трохдзенную летэрэю-алегры дзеля аказання помачы беспрацоўным афіцэрам і бедным семьям афіцэрау і ваенных чыноунікау.

Б. загадчыкі шавецкімі атрадамі скуранога аддзелу У. З. С. К. З. Ф., выключаючы 3-го атраду, паехалі с сваімі афіцыяльнымі падрахункамі—адчотамі у Маскоускі Цэнтральны Камітэт У. З. С. нібы там ужо гара с плеч упадзе.

Сьвато сьв. Тройцы будзе па новаму стылю 19 мая, дзеля чаго у местовай управе служачыя каталікі увальняюцца ад працы на два дні.

У местовым крэдытным т-ве 15 мая адбыуся гадовы сход упоунамоцных (замест 72 было толькі 57). Праглядзен і пацьверджан падрахунак за 1917 г. (XXI операцыенны). Прыбытак падрахуначнага году усяго 16793 р. 64 к., шмат меней чым прыбытак 1916 г. (55,945 р. 81 к.), дзеля прычын зьменшэння прыбыткау і павялічэння тратау. Запасны капітал Т-ва—500,904 р. 12 к., аблігацый у чыннасьці: а) 4½% = 2,045,500 р. б) 5% = 4,322,200 р.; купоны, да выплаты=251,781 руб.

Сабранне упоунамоцных дабаіло прауленню на дарагоулю сутачных 5 р. у дзень.

Выпоунена прозьба а падмозе жане нідауна памершага трагічна сэкрэтара Т-ва М. Я. Фінкельсона у 6,000 р.

Перавыбраны у члены праулення інжэнер Сьвенціцкі (стародумец), у члены дагледваючага камітэту—Валловіч (б. гарадскі галава-старадумец) і Крэйнес (адвакат), а у ацэншчыкі—Пценцоу.

Сход сябору таварыства Беларускай Культуры быў 18-го а 6-ай гадзіне вечара у памешканні „Прэдстауніцтва дзеля абсуджэння пытаннаў:

1) Адчот аб установах Т-ва.
2) Выбары сталага ураду т-ва.

Губ. Земск. Сабранне, адчыніўшаеся як кольвек 10 мая пры 45 гласных (замест 90), праходзіць вяло і монатонна, толькі час ад часу вызываючы ажыуленныя прэніі, як пачынаецца полемічная схватка между левымі і правымі крыламі.

Такія прэніі бывалі глауным чынам пры выбарах камісіі дзеля разгляду агульна-паветовых сьмет, красуючыся розначалібэрнасьцю. Левае крыло угледзіло у гэтай апецы губ. земства жаданне умешываціся у сьметныя справы паветовых і валасных «вольніц» земствау.

Камісія с 4-х усе-ж такі выбрана.

Прынят губ. земствам праэкт Злобіна а перадачы земству усіх вышэйшых пачатковых школ (б. гарадзкія) губэрні, вучачыя пэрсонал якіх ні атрымлівае с казны пэнсіі ад новага году, жыбучы глаунае платай за праваўчэнне.

Па ініцыятыве губ. зем. управы атпушчэно 11000 руб. % прыбавак пэнсіянэрам, пэнсіонная касса для служачых губ. земства.

Расходная сьмета сваім разглядам заняла ½ тыдня часу ад 11 гадз. з рана да 12 гадзін у ночы амаль кожнага дня.

Пажадаем, каб выбраная сабраннем камісія дзеля рэвізіі земскай працы па ліквідацыі „У. З. С." сурьезна аднеслася да сваей місіі.

Народны дом імені Максіма Багдановіча аткрыецца сягоння 19 мая. На аткрыцце ставіцца новая п'еса Галубка „Безвінная кроу". Пастаноука Ф. Ждановіча.

Украінскі консул назначаны у Менск, мае прыбыць у бліжэйшых днех сюды, на мейсцо службы.

Весткі с краю.

Хаценчыцы, Віл. губ. Вілейск. павету.

Да прыходу нямецкага войска у нашай воласьці было ціха: ні рабовалі так маентакаў, як у прыфронтовай паласе, альбо як у цэнтральных губэрнях Расіі. Селяне секлі сабе на будову лес, але і то за дазваленнем камітэту; досыць часта бывалі сходы, на каторых гаварылося больш а зямельнай справе. У гэтым часе быў адзін выпадак, калі на маентак Малые-Бяседы напалі таварышы з Сыбірскага, корпусу, каторыя чаго ні маглі узяць, дык прыкладамі паламалі. Гэтакім парадкам згінула цэнная бібліотэка, у каторай много было кніг а нашым краі. Згінулі дарагія абразы, мэблі, пасуда і інш. Салдаты пасьля прадавалі награбленае дабро селянам. Калі паглядзець на рабунак прышлі селяне, таварышы іх амаль ні пабілі, кажучы, чаму яны да гэтага часу ні разграбілі двара.

Потым, заахвочаныя «добрым прыкладам», зьбіраліся нікаторыя разумненькія селяне разграбіць і Лукавец, але дзякуючы валасной адміністрацыі гэтаго зроблено ні было.

У той час, калі нямецкае войско занімало Беларусь, а рускія таварышы у безпарадку, як стада без пастуха таўкліся па дарозе к Барысаву, селяне аднэй з акалічных вёсак (Мінскай губ.) узброіўшыся вінтоўкамі прыехалі у м. Малые-Бяседы і разграбілі яго да шчэнту: ні аставілі насення, ні аставілі нават хлеба для парабкоў, якіе там служылі. Ніусцярагліся ад пакусы і селяне нашай воласьці—захацелося чужога дармовага дабра—прылучыліся і яны і памаглі наездным госьцікам рабаваць. Так у працягу 10 месяцаў свабоды у нашай воласьці было спакойна ад гэтакаго ліха, а тут у гэтакую неспакойную гадзіну усе-ж такі ні вытрымалі, каб ні паганьбіць свайго імені. Вінаваты у гэтым тыя нівядомыя правакатары, каторыя пусьцілі чутку, што бальшавікоў прагналі ні немцы, але палякі, каторым хочуць аноў увесьці паншчыну. Праз дзён 5 памешчыкі пачалі ездзіць па вёсках ды рабіць обыскі і адбіраць награбленае дабро; здаралося пры гэтым і так, што забіралі у нікаторых і апошніе насення.

Створаны большэвікамі Савет у воласьці істнавау до 15-го сакавіка стар. стылю, а пасьля быў распушчан нямецкім камэндантом. Мелася быць земства, але цяпер пакуль што воласьць упраўляецца адным прэдседацелем бышага савету.

У пасьледнім месяцу у воласьці забіто 3 чалавекі: адзін каля Казлоў з мэтай рабунку, другі у Панышох, злоўлечаго на крадзежы; трэцяго у Малых-Бяседах: німа ведама пакуль што, аткуль ен, хто забіў і за што.

23 красавіка с. стылю на 2-гі дзень Вялікадня у нашых Хаценчыцах адбыўся Беларускі спэктакль. Тутэйшая моладзь, арганізавушаяся ішчэ у пачатку марца гэтага году у таварыства «Вянок», ставіла на сьвятах «Паўлінку» Я. Купалы. Нашыя Хаценчыцы пэуно ад стварэння сьвету ні відзелі тэатру, але дзякуючы сябрам «Вянка» многа селян мела магчымасць відзіць сцэнічную штуку. «Паўлінка» прашла з вялікім шыкам. У афішах пісалося, што увесь даход пойдзе на Народную Бібліотэку у Хаценчыцах. Тутэйшая інтэлігенцыя сэрдэчна адклікнулася на добрае пачынанне «Вянка». Артысты гралі наагул добра, ніхто нават ні спадзяваўся, што ім так удасцца, бо гэта была іх першая проба сіл. Белая завеса з вялікім на ёй нацыянальным флагам з напісам: «Ніхай жыве Вольная Беларусь» пры сьветле агнеу будзіла радасныя думкі у душах праўдзівых беларусаў аб будучыне нашай гаротнай бацькаушчыны.

Б—ка.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоунага камандавання за 18 мая 1918 року.

Захадны тэатр вайны:

На баевых фронтах слабая, на працягу дня, пяхотная чыннасьць значна ўмацавалася перад надходам цемнаты. Мочны разбураючы агонь цягнуўся ўсю ноч. Надужаўшая чыннасьць разведчыкаў даводзіла да рукапашных схваткаў, асабіста ў ваколіцы Ласіны,—ні раз забіраліся палонныя.

Учора зьбіты 16 ніпрыяцельскіх аэропланаў і 1 прывязны балён.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

З Віцебску.

(ад уласнага дапісчыка)

С таго часу, як немцы зрабілі новую лінію для сваіх войск і занялі Менск, беларусы на Віцебшчыне і Магілёўшчыне, пазасталых пад большэвікамі, жывуць прыпадковымі і часцей ніпраўдзівымі весткамі аб сваім цэнтру.

А патрэба у праўдзівай інформацыі ёсць вялікая, бо тутэйшыя беларускія арганізацыі чакаюць слова імення здтуль, з Менску і Вільні, каб ведаць як ім трымацца і што рабіць сярод пануючай чорнай большэвіцкай рэакцыі, знайходзючыся у падполлі. Шырокае грамадзянство надта цікавіцца адносінамі нямецкага ураду да Беларускіх нацыянальных дамаганняў, пазыцыяй, якую маніцца ці ужо заняў Народны Сэкрэтарыят да Расіі, аб грашавых справах, друку і інш.

І Віцебшчына, як усё што ішчэ лічыцца пад уладай усерасійскага «совнаркома», жыве, «савецкім» жыццём. Але жыхарам ад гэтаго ні лягчэй. Беспрацоўных у горадзе Віцебску да 5 тысячаў. У бедных кварталах галодны стогн. Хлеб даходзіць ужо да 10 рб. фун., бульба каштуе 50 рб. пуд, мясо 5 рб. фунт, масло 12 рб.

1 мая адбудуцца перавыбары у Віцебскі местовы Савет. Па настрою работнікаў можна спадзявацца бальшэвіцкаго правалу.

Уцекачы зьбіраюцца адгэтуль у свае родныя куткі.

Як аб навасьці можна паведаміць, што пры камісарыяце на цыянальных справаў пры цэнтральным «совнаркомё» залажыўся цэнтральны-ж Беларускі нацыянальны Камісарыят, які выдае сваю вестку — «Дзянніцу»,—штылям савецкіх «Праўдаў». Большэвікі ні было адпусьцілі вялікія грошы. Пры губэрнскіх «саветах» на Беларусі закладаюць губэрнскія Бел. Нар. Камісарыяты. Заводзяцца такі і у Віцебску.

Апошняя навасьць: Камісарам унутраных справаў ліквідавана пачатая тутака соцыялізацыя нерухомых маетнасьцяў у Віцебску. Камітэт соцыялізацыі і восім райённых камітэтаў распушчаны, служачыя звольнены ад абавязкаў. «Дасьвядчэнне» абышлося совдепу у поумільёна рубл. Дзякуючы соцыялізацыі на 1918 год спадзеваны быў дэфіцыт узвыш 2 мільён. рбл.

Авадзень.

Гомон Беларуса.

Спячы Народ Беларускі ўставай!
Брыся да працы агульнай:
Багаты і бедны, вучоны, ратай,
Ідзі да работы упульнай.

* *

Брат-брату падайце, вы, рукі свае,
У згодзе з сабой пачынайце
Будоўлю рабіце і моцны яе
Каменны фундамэнт складайце.

* *

Патрэбная гэта будоўля для нас
І у прышласць для нашых дадзена;
Цяпер жа пара, бо цяпер настаў час—
Адкладываць нельга далей.

* *

Уставайма-ж, браты, Беларускі народ,
Гукайма-ж па целай краіне.
Завем наш народ да цяжкіх работ.
І праца та наша ні згіне!

Міхалка Махевенко.

12 Мая 1918 р.
Менск.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.